*gerne dem stärksten* (Бог помогает сильнейшим); *Gott hilft dem Kühnen* (Бог помогает смелым); *Wer früh aufsteht, viel verzehrt, wer spät aufsteht, den Gott ernährt* (Кто рано встает, много и потребляет, кто поздно встает, тому Бог дает); *Die Lacher hat Gott lieb* (Бог любит неунывающих); *Gott hilft dem Arbeitsamen* (Бог помогает трудолюбивым); *Gott hilft keinem Faulen* (Бог не любит ленивых); *Der muss Gottes Ehre verletzen, der das Gold sich macht zum Götzen* (Тот должен лишиться божьего почитания, кто золото делает своим идолом); *Gott weiß wohl, warum er der Geiß den Schwanz abgehauen hat* (Бог хорошо знает, почему козе отрубил хвост). В составе утверждаемых таким образом ценностей оказываются смирение, добрый нрав, смелость, правда, безгрешие, честность, трудолюбие, милосердие, щедрость, жизнерадостность.

Отраженные здесь наблюдения позволяют прийти к выводу, что объективация духовных ценностей в разных этнических лингвокультурах отражает одни и те же мыслительные стереотипы: 1) духовная ценность есть высшая, непреходящая ценность; 2) объекты, представляющие духовную ценность (как, впрочем, и любые другие объекты, постигаемые в ценностном отношении), характеризуются как положительными, так и отрицательными свойствами; 3) духовное выявляет связь с материальным, служит оценке включения человека в структуру бытия.

Существование этих стереотипов детерминирует типичное в объективации ценностей и объясняет наличие надэтнического, а вернее, общечеловеческого компонента в любой этнической культуре.

**Список использованных источников**


1 Савенкова, Л. Б. Русская паремиология: семантический и лингвокультурологический аспекты / Л. Б. Савенкова. – Ростов н/Д. : Изд-во Рост. ун-та, 2002. – 240 с.

2 Даль, В. И. Напутное // Пословицы русского народа / В. И. Даль. – М. : Изд-во Эксмо, Изд-во ННН, 2005. – С. 5−16.

3 Boggione, V. Dizionario dei proverbi. I proverbi italiani organizzati per temi / V. Boggione, L. Massorbio – Torino : UTET, 2007. − 654 p.

4 Пермяков, Г. Л. Избранные пословицы и поговорки народов Востока / Г. Л. Пермяков. – М. : Наука, 1968. – 376 с.

5 Кириллова, И. В. Лингвокультурологическая специфика когнитивной оппозиции «ум-глупость» в русской языковой картине мира : автореф. дис. ... канд. филол. наук : специальность 10.02.01 / И. В. Кириллова. – Нижний Новгород, 2012. – 21 с.

6 Ничипорчик, Е. В. Отражение ценностных ориентаций в паремиях / Е. В. Ничипорчик; М-во образования РБ, Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2015. – 358 с.

7 Даль, В. И. Пословицы русского народа / В. И. Даль. – М. : Изд-во Эксмо, Изд-во ННН, 2005. – 616 с.

8 Библия в пословицах и поговорках. – М.: Изд-во Московского Подворья Свято-Троицкой Сергиевской лавры «Троицкое слово», 2000. – 264 с.

9 Paczolay, G. European proverbs in 55 languages with Equivalents in Arabic, Persian, Sanskrit, Chinese and Japanese / G. Paczolay. − Hobard, Tasmania: De Proverbio.com, 2002. − 527 p.

10 Мокиенко, В. М. Большой словарь русских пословиц / В. М. Мокиенко, Т. Г. Никитина, Е. К. Николаева; под общ. ред. В. М. Мокиенко. − М.: ОЛМА Медиа Групп, 2010. − 1024 с.

11 Прыказкі і прымаўкі: ў 2-х кн.; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976.

12 Wander, K. F. Deutsches Sprichwörterlexikon: Vol. 1 –5. – Leipzig, F. A. Brockhaus. 1867–1880.


УДК 801.81:398.33(=16)

**В. С. Новак**

## ЗОРКІ Ў НАРОДНЫХ ВЕРАВАННЯХ БЕЛАРУСАЎ

*У артыкуле на багатым аўтэнтычным матэрыяле, запісаным у розных рэгіёнах Беларусі, аналізуюцца народныя вераванні, звязаныя з зоркамі, аргументуецца і ілюструецца*

*шматлікімі фактычнымі звесткамі іх сувязь з душамі памерлых, асэнсоўваюцца з’ява персаніфікацыі зорак і ідэя іх множнасці.*

У сістэме народных вераванняў славян важнае месца адводзіцца міфалагічным уяўленням, звязаным з зоркамі. «Зоркі – нябесныя целы, якія суадносяцца з лёсамі людзей і аказваюць уплыў на «зямныя» падзеі» [1, с. 290]. Менавіта ў пераважнай большасці міфалагічных матэрыялаў, запісаных у палявых экспедыцыях, гучыць матыў арганічнай сувязі зорак і людзей: *«Ну, а зоркі – гэта ўжо людзі. Колькі людзей на зямлі, столькі і зорак на небе»* (запісана ў в. Асінаўка Светлагорскага раёна ад Рудніцкай Наталлі Сяргееўны, 1931 г.н.). Факт суаднесенасці ў народнай свядомасці колькасці людзей з колькасцю зорак пацвярджаецца шматлікімі прыкладамі запісаў: *«Веру я, што зорак на небе столька ж, колькі людзей у свеце»* (запісана ў в. Стрэльск Мазырскага раёна ад Мельчанка Алены Міхайлаўны, 1929 г.н.). Як адзначыла жыхарка в. Валаўск Ельскага раёна Галіна Пятроўна Чорная, 1930 г.н., *«колькі на небе звёзд, столькі на галаве ў людзей валос»*.

У некаторых тэкстах міфалагічных апавяданняў можна знайсці звесткі, згодна з якімі *«зоркі – гэта быццам душы чалавечыя»* (запісана ў в. Аўсімавічы Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці ад Архіпенка Надзеі Васільеўны, 1932 г.н.); *«Колькасць зорак на небе – гэта мёртвыя душы»* (запісана ў г.п. Акцябрскі ад Паўлюковай Надзеі Сямёнаўны, 1924 г.н.); *«Звёзды на небі – то душы людзей»* (запісана ў в. Саўгасная Буда-Кашалёўскага раёна ад Габрусевай Кацярыны Лагвенаўны, 1932 г.н.). «У зоркіператвараюцца душы памерлых, нярэдка – самазабойцаў (усх.-слав.) або нехрышчоных дзяцей (пол., з.-бел., палес.), якія з неба свецяць сваім бацькам на зямлі (пол.)» [1, 292]. У паэтычна-міфалагічнай інтэрпрэтацыі жыхароў в. Шырокае Буда-Кашалёўскага раёна *«на зорках жывуць душы памерлых людзей, і яны сочаць за жывымі»* (запісана ад Емяльянчыкавай Марыі Цімафееўны, 1931 г.н.).

Паходжанне зорак, зыходзячы з народна-хрысціянскіх вераванняў, звязана са стварэннем Богам першага чалавека – Адама: *«Гавораць, як Бог сатварыў Адама, так і першая зорка паявілася»* (запісана ў в. Сякерычы Петрыкаўскага раёна ад Кісель Ніны Адамаўны, 1932 г.н.). У сувязі з гэтым устойлівы характар бытавання маюць уяўленні аб тым, што *«калі загаралася зорка на небе, то казалі, што нарадзілася дзіця»* (запісана ў в. Мікітаўка Брагінскага раёна ад Данчанка Васіліны Ціханаўны, 1944 г.н.); *«Як нараджаецца чалавек, то на небе зорачка паяўляецца»* (запісана ў в. Саўгасная Буда-Кашалёўскага раёна ад Габрусевай Кацярыны Лагвенаўны, 1932 г.н.). Смерць чалавека сімвалічна асэнсоўвалася як згасанне зоркі або яе «падзенне». *«А калі тэй чалавек памірае, дык зорка падае»* (запісана ў в. Саўгасная Буда-Кашалёўскага раёна ад Габрусевай Кацярыны Лагвенаўны, 1932 г.н.); *«Зоркі – гэто людзі, што родзіліса, а як хто-небудзь памірае, то зорачка падае»* (запісана ў в. Вулька – 2 Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці ад Пясоцкай Евы Васільеўны, 1937 г.н.).

Паводле касмалагічных уяўленняў беларусаў, зоркі асацыіруюцца з «іголкамі маланкі»: *«Раньшэ казалі, што звёзды – гэта іглы молніі, бо яны такія яркія, як молнія»* (запісана ў в. Валаўск Ельскага раёна ад Чорнай Галіны Пятроўны, 1930 г.н.)

Асобную групу міфалагічных апавяданняў складаюць тэксты, у якіх пра зоркі гаворыцца як пра вочы Бога: *«Я больш думаю, што гэто вочкі Бога і вон глядзіць за намі»* (запісана ў в. Вулька – 2 Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці ад Пясоцкай Евы Васільеўны, 1937 г.н.); *«Зоркі з’яўляюцца вокам Бога, які сочыць за зямнымі істотамі»* (запісана ў в. Хамянкі Нараўлянскага раёна ад Ефіменка Барыса Ціханавіча, 1929 г.н.). Прыведзеныя прыклады народных вераванняў адпавядаюць міфалагічным уяўленням усходніх славян: «Зоркі уяўляюцца як «вочы» Бога або адтуліны, «вокны» на небе …, праз якія ноччу Бог назірае за падзеямі на Зямлі (балг.), анёлы сочаць за паднябесным светам і ўтаймоўваюць злых духаў (рус. тул.), праведнікі глядзяць з раю на зямлю (серб.…)» [1, с. 291]. Як адзначылі жыхары в. Лядцы Гомельскага раёна, «*зоркі на небе ўяўлялі, што гэта домікі ангелаў. І калі ўвечары свецяць тыя звёздачкі, то кажуць, што гэта ангелы адкрылі свае акошачкі*» (запісана ад Кашлаковай Матроны Зосімаўны, 1927 г.н.).

Ад таго, як блішчыць зорка, зыходзячы з народных уяўленняў, залежыць характар чалавека: *«Калі зорка гарыць вельмі ярка, то чалавек добры. Раней казалі, што калі зорка падае і ад яе застаецца яркі след, то гэта чалавек памірае добры»* (запісана ў в. Сінічына Буда-Кашалёўскага раёна ад Раманоўскай Лідзіі Іванаўны, 1933 г.н.). Іншы раз невыразнае цьмянае ззянне зоркі, як адзначылі жыхары в. Перасвятое Рэчыцкага раёна, было звязана з грахоўнымі паводзінамі чалавека: *«Калі чалавек многа грашыць, то яго зорка чуць блісціць, а калі мала, то яна свяціць ясна-ясна»* (запісана ад Грабок Анастасіі Паўлаўны, 1936 г.н.); *«Кажуць, што калі чалавек плахі, то ў яго і зорка неярка свеціць»* (запісана ў в. Аўсімавічы Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці ад Архіпенка Надзеі Васільеўны, 1932 г.н.). Жыхары в. Сінічына Буда-Кашалёўскага раёна верылі, што хуткае згасанне зоркі таксама звязана з грахамі чалавека: *«Калі адразу згасае, то памірае злодзей ці нейкі грэшнік яшчэ»* (запісана ад Раманоўскай Лідзіі Іванаўны, 1933 г.н.). У мясцовай традыцыі жыхароў Брэстчыны падзенне зоркі таксама было абумоўлена людскім грахом: *«А як хто саграшыў, то зорачка падае»* (запісана ў в. Вулька-2 Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці ад Пясоцкай Евы Васільеўны, 1937 г.н.). Імгненнае падзенне зоркі на зямлю сімвалізуе смерць чалавека, які ў жыцці шмат грашыў. «Прычым, калі памірае грэшнік, яго зорка адразу падае долу, зорка ж чалавека справядлівага ляціць або ў бок або проста ўгару» [2, с. 195].

Велічыня зоркі і яе яркасць у начным небе сімвалізавалі лёс чалавека, напрыклад, меркавалі: *«чыя зорка большая, ярчэйшая, значыцца, той болей і пражыве»* (запісана ў в. Асінаўка Светлагорскага раёна ад Рудніцкай Наталлі Сяргееўны, 1931 г.н.). Паводле народных вераванняў, *«зорачка, якая каціцца, гэта нехрышчонае дзіця, якому Бог нідзе не дае месца на тым свеце. Калі бачыш такую зорку, трэба перахрысціцца і сказаць: «Ідзі ў рай, каб Бог яго прыняў да сябе»* (запісана ў в. Мікітаўка Брагінскага раёна ад Данчанка Васіліны Ціханаўны, 1944 г.н.).

Як сведчаць успаміны носьбітаў скарбаў народнай мудрасці, зоркі – гэта не толькі астранамічная з’ява, але і сутнасць нашага жыцця: *«Яшчэ казала, што звёзды – гэта наша жыццё, гэта мы»* (запісана ў в. Юшкі Калінкавіцкага раёна ад Рагальскай Марыі Міхайлаўны, 1930 г.н.); *«Зорка – гэта жызнь чалавека»* (запісана ў в. Сякерычы Петрыкаўскага раёна ад Кісель Ніны Адамаўны, 1932 г.н.). Знешняя велічыня зоркі сімвалізуе ступень праяўлення ў характары чалавека добрага і злоснага: *«Калі звязда вялікая, то ты добры чалавек і дарыш людзям дабро. Калі малая і нябачная, то ты злы чалавек»* (запісана ў в. Юшкі Калінкавіцкага раёна ад Рагальскай Марыі Міхайлаўны, 1930 г.н.).

Даследчыкі адзначаюць, што «мноства зорак асацыіруецца з незлічонай колькасцю якіх-небудзь прадметаў у загадках, прыкметах, варожбах пра ўраджай; рытуалах, звязаных з пладавітасцю жывёлы і інш.» [1, с. 293]. Варта падкрэсліць, што выяўленая навукоўцамі ідэя суаднесенасці зорак з рознымі прадметамі пацвярджаецца шматлікімі фактычнымі запісамі. Напрыклад, як прыгадала Тамара Фёдараўна Медзіна, 1941 г.н., жыхарка г. Гомель, *«яны (зоркі) падобныя на рассыпанае зерне або на мноства жукоў-светлякоў, што ўзняліся высока-высока».* У рытуалах, звязаных з каляднай варажбой, гэта ідэя «множнасці» атаясамліваецца з багатым ураджаем зерневых культур, ягад, грыбоў і інш. «Так, зорнае неба на куццю прадвяшчала багатыя пчаліныя раі і наагул прыбытак на ўсё: збажыну, скаціну і дзяцей, а таксама ўраджай грыбоў і ягад, багата яек» [3, с. 197]. Прыведзены тэзіс можна праілюстраваць шматлікімі прыкладамі: «Як сільна багата на Коляды звёзд, эта будзе грыбоў сільна багата, а як будзе хмурна – будзе такое даждлівае лета» (в. Дворышча Хойніцкага раёна) [4, с. 89]; «Калі на Каляды ноччу шмат зорак у небе, то ўлетку ждзі багаты год на грыбы» (в. Рафалаў Брагінскага раёна) [4, с. 90]; «На розныя куцці прыкмячаюць: як багата зорак – багата ягад, грыбоў – ураджай багаты» (в. Маканавічы Рэчыцкага раёна) [4, с. 93].

Нешматлікімі з’яўляюцца і звесткі пра забароны, звязаныя з зоркамі, напрыклад, *«на зоркі няможна паказваць пальцам, а еслі паказваць, то яго трэба ўкусіць 3 разы»* (запісана ў в. Вулька Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці ад Якубовіч Аляксандры Іванаўны, 1936 г.н.).

Прыведзеныя матэрыялы з’яўляюцца яскравым сведчаннем паэтычнасці светапогляду

беларусаў, устойлівасці захавання міфалагічных уяўленняў, звязаных з зоркамі як «важным элементам астранамічнага кода традыцыйнай мадэлі свету» [3, с. 195].

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1 Славянские древности: Этнолингвистический словарь в 5-ти томах / Под общей ред. Н. И. Толстого. – Т. 2: Д– К (Крошки) – М. : Междунар. отношения, 1999. – 704 с.

2 Міфалогія беларусаў: Энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мн. : Беларусь, 2011. – 607 с.

3 Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С.Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – 2-ое выд., дап. – Мн. : Беларусь, 2006. – 599 с.

4 Прыкметы і павер'і Гомельшчыны / укладанне, сістэматызацыя, тэксталагічная праца, уступныя артыкулы В. С. Новак, А. А. Кастрыца. – Гомель : Барк, 2007. – 224 с.



УДК 811.161.3:37.016:39



**А. М. Палуян**


## НЕЗВЫЧАЙНАЕ Ў ЗВЫЧАЙНЫМ
## (этнакультурная інфармацыя на занятках па беларускай мове)


*Артыкул прысвечаны ролі беларускай безэквівалентнай лексікі, фразеалагізмаў, прыказак, прымавак, загадак, прозвішчаў у захаванні і перадачы этнакультурнай інфармацыі.*


Антрапацэнтрычная канцэпцыя выкладання мовы накіравана на фарміраванне лінгвістычнага мыслення студэнтаў і выхаванне нацыянальна свядомай моўнай асобы з актыўнай жыццёвай пазіцыяй.

На думку метадыстаў, навучальны працэс не можа абмяжоўвацца выключна адукацыйнымі мэтамі і задачамі, ён павінен быць цесна звязаны з выхаваннем асобы. У адпаведнасці з гэтым дыдактычны матэрыял, які выкарыстоўваецца на занятках, павінен спрыяць выхаванню павагі да нацыянальных святынь, раскрываць сутнасць беларускага ладу жыцця, багаты свет традыцый нашага народа, вучыць выпрацоўваць грамадзянскую пазіцыю, выхоўваць патрыятычныя пачуцці, любоў да вялікай і малой радзімы, пашыраць кругагляд студэнтаў, дапамагаць усвядоміць нормы і ўзоры паводзін у калектыве, і пры гэтым адпавядаць высокай мастацкасці.

Як вядома, кожная мова стварае сваю карціну свету і адлюстроўвае рэчаіснасць крыху інакш, чым іншыя мовы. Адрозненні ў гісторыі і ўмовах жыцця, спецыфіка развіцця грамадскай свядомасці народа абумоўліваюць розныя шляхі ад пазамоўнай рэальнасці да паняцця і далей да выражэння яго ў слове. Інакш кажучы, карціна свету атрымлівае ў кожнай нацыянальнай мове нацыянальную форму выражэння.

Любая мова выконвае некалькі асноўных функцый: камунікацыйную, інфармацыйную, эматыўную і, што найбольш важна, функцыю фіксацыі і захавання ўсяго комплекса ведаў і ўменняў дадзенай моўнай супольнасці пра свет. Такія ўніверсальныя веды – вынік працы калектыўнай свядомасці – зафіксаваны ў мове, перш за ўсё ў яе лексічным і фразеалагічным складзе.

Умовы сацыяльна-палітычнага, грамадска-эканамічнага, культурнага жыцця і побыту народа, яго светапогляд, псіхалогія, традыцыі і г.д. абумоўліваюць узнікненне паняццяў, якія прынцыпова адсутнічаюць у носьбітаў іншых моў. Адпаведна, у іншых мовах (у прыватнасці – рускай) да большасці такіх слоў не будзе аднаслоўных эквівалентаў пры іх перакладзе Для ілюстрацыі дадзенага сцверджання студэнты вызначаюць лексічнае значэнне такіх слоў, як